Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 СНЕЖНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 245 (27610) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Па надзею, па радасць, па шчасце!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦУДЫ ЗДАРАЮЦЦА

Адыходзячы год адлічвае апошнія хвіліны... Зусім хутка мы збяромся разам са сваімі роднымі і блізкімі, каб аддзячыць яму за ўсё добрае і пад бой курантаў падняць келіхі за год надыходзячы. На некалькі імгненняў мільёны людзей з'яднаюцца ў адзіным парыве, адзіным памкненні — данесці да нябёсаў свой самы важны пасыл. Мы адкінем усё дробязнае і другараднае, каб у навагоднюю ноч засяродзіцца на галоўным. Што гэта будзе? Здароўе, каханне, прызнанне, грошы?.. Даўгалецце бацькоў, уладкаванасць дзяцей, паразуменне з блізкімі, памнажэнне дабрабыту? У гэты момант кожны падумае пра сваё, але ўсе мы — маладыя і сталыя, мудрыя і наіўныя, акрыленыя і прыземленыя, вернікі і атэісты — будзем марыць пра цуд. Той самы цуд, які пасылаецца не ў якасці ўзнагароды за добрыя паводзіны, а проста так, без усялякіх умоўнасцяў. І тады... Звычайны гарбуз ператвараецца ў карэту, сціплае адзенне — у каралеўскія строі, двухпакаёўка — у палац... Злыя становяцца добрымі, сквапныя — шчодрымі, бедныя — багатымі, а дурні — разумнымі... У прынцыпе, нічога невыканальнага і нерэальнага ў нашых жаданнях няма. Толькі чамусьці вельмі хочацца, каб над іх увасабленнем «папрацаваў» нехта іншы — дзесьці там, у іншым вымярэнні. І потым «явіў» нам цуд. ...Апошнія хвіліны адыходзячага года. Мы запальваем свечкі і загадваем жаданні, выдатна разумеючы, што прыкладаць намаганні для іх увасаблення давядзецца самім. Пакуль жывём, мы вучымся быць чараўнікамі і рабіць тое, што ў нашых сілах, — для сябе, для блізкіх, для знаёмых і незнаёмых людзей. А ў выніку адбываюцца цуды — самыя сапраўдныя, зямныя... Верце ў іх і заўсёды спадзявайцеся на лепшае! Менавіта гэтага, дарагія чытачы, зычаць вам у Новым годзе супрацоўнікі «Звязды» і героі нашага святочнага нумара.

Каляды...
Святы
ў шумным
карагодзе...
Прыждалі мы
Чароўнае пары —
Зноў Новы год...
А што?
Няхай прыходзіць!
Адно —
хай будзе лепшы,
чым стары!

Валянціна ДОЎНАР.

ISSN 1990 - 763X